УДК 947.6 (=411.6) «1914/1916»

# ВАЕННАПАЛОННЫЯ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Міхаіл Цуба***
*Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, Пінск, Беларусь*

Артыкул прывечаны пытанню ваенна палоннонных часоў Першай сусветнай вайны

***Ключавыя словы: Першая сусветная вайна, ваеннапалонныя, Антанта, Чырвоны крыж***

Год таму адбылося шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных стагоддзю завяршэння Першай сусветнай вайны. Аднак цікавасць да падзей гэтай вайны апошнім часам толькі ўзрастае. І гэта зразумела, па-ранейшаму яшчэ захоўваецца шмат нераскрытых аспектаў і белых плямаў, звязанных з падзеямі болей чым стогадовай даўнасці. Увогуле на працягу звыш сямідзесяці гадоў у сусветнай гістарычнай навуцы і літаратуры аб дадзенай вайне імкнуліся забыць. Нават салдатам, паўшым у ёй, было адказана ў памяці - на тэрыторыі былога СССР захавалася толькі мізэрная колькасць недагледжаных, закінутых на забыццё вайсковых могілак 1914-1918 гг, а большасць з іх была зруйнавана і знесена.

Што ўжо гаварыць у гэтым накірунку аб праблематыцы, звязанай з ваеннапалоннымі. А менавіта Першая сусветная вайна парадзіла небывалую раней колькасць ваеннапалонных – 7,5 млн. чалавек. Прычым палову ваенных страт Расійскай імперыі ў вайне склалі менавіта ваеннапалонныя (2,5 млн. чалавек). У той жа час амаль 3 млн. салдат і афіцэраў праціўніка былі захоплены ў палон расійскай арміяй.

Напрыклад, Германія за час вайны змагла ўзяць у палон 2,5 млн. чалавек. Колькасць ваеннапалонных краін Антанты складала крыху больш за 4 млн. чалавек (600 тысяч – Італія, пасля таго як яна перайшла на бок Антанты, 506 тысяч – Францыя, 170 тысяч – Велікабрытанія). Ваеннапалонных Цэнтральных краін дасягала амаль 3,5 млн., з іх 2.2 млн. аўстра-венгерскай арміі і каля 1 млн. германскай, астатнія прыходзяцца на Турцыю, Балгарыю, Італію да перахода апошняй на бок Антанты. За гады вайны ў палоне загінула звыш 500 тысяч чалавек [1, с.227].

Прыведзеныя вышэй дадзеныя бяспрэчна прыкладныя, яны ўзятыя ў аснове з падлікаў расійскага белаэмігранцкага гісторыка генерала М.М. Галавіна, які прааналізаваў і даследаваў лічбы ўліку ваеннапалонных з расійскіх, германскіх, а таксама аўстрыйскіх архіваў. У выніку большасць гісторыкаў спасылаюцца менавіта на гэтыя лічбы. Такі самы лік ваеннапалонных вызначаны і ў Вікіпедыі, аднак сёння ў шэрагу сучасных выданняў лічбы толькі расійскіх ваеннапалонных сягаюць ад 2,8 да 3,9 млн. чалавек[2,с.303].

З якой статыстыкі гэта ўзята? Першыя спробы падліку колькасці ваеннапалонных расійскай арміі прадпрымаліся яшчэ падчас вайны. У снежні 1916 года Аддзел аб ваеннапалонных пры міністэрстве замежных спраў Расійскай імперыі падлічыў, што ў варожым палоне знаходзілася 2,5 млн. расійскіх салдат і афіцэраў. Але ў перыяд

Репозиторий ПолесГУ

кіраўніцтва Часовага ўрада на запыт прадстаўніка французскай ваеннай місіі генерала Жанена аб стратах расійскіх войск, са Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве ад 10 кастрычніка 1917 года было адказана, што страты расійскай арміі палоннымі складаюць 2 млн. 43 тысячы 548 чалавек. Пэўныя падлікі дадзенага накірунку вяліся і падчас савецкай улады, пры гэтым вышэй адзначанная лічба мела істотны рост. Напрыклад, у даведніку "Расія ў сусветнай вайне 1914-1918 гг.", выдадзеным ЦСК РСФСР у 1919 годзе, колькасць расійскіх ваеннапалонных па стане на 1 верасня 1917 года складала 3 млн. 343 тысячы 900 чалавек. Але ў тым жа годзе статыстычны даведачны аддзел савецкай Цэнтральнай калегіі аб палонных і бежанцах абнародаваў дадзеныя, згодна з якімі ў палоне аказаліся 3 млн. 911 тысяч 100 расійскіх салдат. На мой погляд патрэбна крытычна адносіцца да гэтых падлікаў па той прычыне, што ў дадзеных даведніках у многіх выпадках інфармацыя аб адным і тым жа ваеннапалонным даволі часта дубліравалася па розных картатэках.

Нягледзячы на 23-ці артыкул Гаагскай канвенцыі, прынятай 18 кастрычніка 1907 года аб законах і абычаях сухапутнай вайны, дзе забаранялася "забіваць ці раніць праціўніка, які склаўшы зброю і не маючы болей сродкаў змагацца здаўся ў палон", усе ж такі існавалі выпадкі, калі ваеннапалонны мог падвергнуцца здзекам і нават паплаціцца жыццём падчас здачы ў палон, альбо падчас канваіравання. Зноў жа, згодна з пастановай Гаагскай канвенцыі забаранялася накіроўваць ваеннапалонных на наступныя работы: капаць акопы, рабіць тыя ці іншыя ўмацаванні, звязанныя з ваеннай спецыфікай, рыхтаваць гарматы, выпускаць снарады, кулі і ўвогуле займацца іншай працай, вынікі якой накіраваны супраць сваіх суайчыннікаў. Ад самых розных іншых работ ваеннапалонныя не мелі права адказвацца [3, с.136].

Аднак расійскае самадзяржаўе ігнаравала гэтыя патрабаванні. Справа ў тым, что многія славянскія народы, якія ўваходзілі ў Аўстра-Венгрыю, не жадалі ваяваць за прагніўшую імперыю Габсбургаў і масава здаваліся ў палон расійскай арміі. Напрыклад, сярод ваеннапалонных аўстра-венгерскай арміі было каля 400 тысяч чэхаў і славакаў, 250 тысяч славенцаў і харватаў, 200 тысяч палякаў і амаль столькі ж русінаў-украінцаў. Такім чынам, з палонных славян (у асноўным з чэхаў і славакаў) у Кіеве быў сфарміраваны вайсковы корпус колькасцю 60 тысяч чалавек. Дабраахвотны ўступ у корпуса вызваляў ад статуса ваеннапалоннага. Менавіта гэты корпус на пачатку 1917 года ўжо прымаў актыўны ўдзел у ваенных дзеяннях на фронце. Пасля кастрычніцкага перавароту 1917 года Ленін, адпрацоўваючы нямецкую дапамогу і грошы, здаў не толькі Беларусь і Прыбалтыку кайзераўскай Германіі, але і абавязваўся здаць немцам дадзены корпус, як ваеннапалонных. У гэтых умовах, будучы ў заложніках, прадстаўнікі корпуса падпісалі дамоўленнасць з Францыяй, якая не збіралася па прыкладу бальшавікоў падпісваць зняважлівы, ганебны мір з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй, а жадала ваяваць да пераможнага канца. Так Чэхаславацкі корпус стаў часткай французскай арміі. Улічваючы той факт, што шлях на захад быў перакрыты германскімі і аўстра-венгерскімі войскамі, супраць якіх корпус апошнім часам ваяваў, то чэхаславакі пагрузіліся ў цягнікі і паехалі праз Сібір ва Уладзівасток, каб адтуль дабірацца дамоў.

Вялікую актыўнасць у справы клопату аб ваеннапалонных праяўляла маці Мікалая ІІ Марыя Фёдараўна. Пры пасрэдніцтве міжнароднага Чырвонага Крыжа, па яе ініцыятыве, у жніўні 1915 года быў праведзены першы абмен ваеннапалоннымі-інвалідамі. У выніку некалькі тысяч палонных-калекаў з двух бакоў былі адпушчаны з палону і вярнуліся дамоў. Такія абмены адбываліся некалькі разоў, фактычна да выхаду Расіі з вайны. У верасні 1915 года першыя сёстры-міласэрнасці прыбылі з Расійскай імперыі ў Германію, а з Германіі ў Расію, каб аказаць дапамогу сваім ваеннапалонным[4,с.72].

Дзякуючы намаганням інспекцый Чырвонага крыжа, а таксама нейтральных краін ў цэлым утрыманне ваеннапалонных ў лагерных умовах адпавядала ўсталяваным нормам. Вядома, што падчас вайны інтарэсы расійскіх палонных, акрамя таварыства расійскага Чырвонага крыжа, абараняла амбасада Іспаніі, у сваи чаргу інтарэсы германскіх палонных у Расійскай імперыі прадстаўляла Швецыя, а тут жа палонных Аўстра-Венгрыі абараняла Данія.

Патрэбна адзначыць, што далёка не ўсе ваеннапалонныя вялі сябе пакорліва. Спробу збегчы з лагераў, прадназначаных для палонных, імкнуліся ажыццявіць 260 тысяч прадстаўнікоў Расійскай імперыі. З дадзенага ліку змаглі гэта зрабіць і дабрацца да сваіх 60 тысяч 295 чалавек. Сярод вядомых ваеначальнікаў, уцёкшых з палону, можна назваць Міхаіла Тухачэўскага, Лаўра Карнілава, а таксама вядомага французскага генерала і дзяржаўнага дзеяча Шарля дэ Голя.

Ёсць факты, што ў германскім лагеры, прадназначаным для ваеннапалонных, Фрыдрыхсвельт (знаходзіўся паблізу горада Вязель) выходзіў штотыднёвы рукапісны часопіс "Вестник пленных", які прадназначаўся для ўнутранага карыстання. У дадзеным часопісе публікавалася інфармацыя з тэатра ваенных дзеянняў, узятая з нямецкіх газет, матэрыялы аб унутраным жыцці лагера, а таксама разнастайная карэспандэнцыя чытачоў [3, с.136].

Але хутчэй усяго гэта было як выключэнне. Маецца шмат звестак, што менавіта ў Германіі і ў Аўстра-Венгрыі адносіны да захопленых расійскіх палонных былі вельмі жорсткімі. А менавіта на Аўстра-Венгрыю і Германію прыпадала 99% (1% прыпадаў на Турцыю і Балгарыю) усіх расійскіх ваенапалонных, што ўтрымліваліся ў іхніх лагерах. Прычым у аўстра-венгерскіх лагерах знаходзілася прыкладна 1 млн. чалавек, а ў германскіх 1 млн. 400 тыс. Становішча ваеннапалонных расійскай арміі ў гэтых краінах было нашмат горшым у параўнанні з палоннымі іншых краін. Цяжкая праца, голад, пастаянныя здзекі ў рэшце рэшт рабілі сваю справу і расійскія веннапалонныя масава паміралі. Многія паміралі ад тыфа і іншых хвароб. Трэба прызнаць, што медыцынская дапамога як расійскім ваеннапалонным на тэрыторыі Германіі і Аўстра-Венгрыі, так і ваеннапалонным, што ўтрымліваліся ў Расійскай імперыі была зусім кепская. Ёсць звесткі, што з тых паўмільёна аўстра-венгерскіх ваенапалонных, якія знаходзіліся ў сібірскіх лагерах, каля 370 тысяч памёрлі ад воспы і тыфа.  Крыху лепш у расійскіх лагерах ў плане медабслугоўвання былі справы з нямецкімі ваеннапалоннымі, якім у 1916 годзе была накіравана з Германіі вялікая колькасць медыкаментаў і вакцын. Усяго на працягу вайны ў палоне загінула звыш 190 тысяч прадстаўнікоў Расійскай імперыі. Гэта складала прыкладна 9% ад усяго ліку ваеннапалонных. Але ж у параўнанні з загінуўшымі савецкімі ваеннапалоннымі ў гады Другой сусветнай вайны – 3 млн. 226 тысяч чалавек альбо 62% ад агульнай колькасці савецкіх ваеннапалонных, гэта лічба, як бачым, выглядае больш сціпла. Дарэчы ў нямецка-аўстрыйскім палоне памерла не мельш 30 тысяч беларусаў, маецца на ўвазе выхадцаў з пяці (Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Магілеўскай) беларускіх губерняў [5, с.17-18].

Што датычыцца агульнай колькасці палонных і прапаўшых без вестак прадстаўнікоў, адзначаных вышэй беларускіх губерняў, то яны складаюць 450 тысяч чалавек [5, с.285]. Праўда ў гэты лік (катэгорыю палонныя і прапаўшыя без вестак) адносяцца не толькі ваеннапалонныя і прапаўшыя без вестак на фронце, але таксама тыя, хто быў забраны на работы ў Германію і адтуль не вярнуўся, і хто прапаў без вестак на работах сярод ваеннаабавязанных [ 6, с.18].

Мабілізацыя ў армію ў першую чаргу "неблаганадзейных" толькі пагоршыла там агульнае становішча. Ужо на другім годзе вайны сярод салдат пачаліся масавыя нездавальненні вайной, паражэннямі, разрухай і г.д. У тым ліку і на беларускіх землях. Аб чым сведчыць: "Данясенне начальніка штаба Мінскіх ваеннаакружных упраўленняў да мінскага губернатара", дзе гаворыцца, што "Па назіранню за ніжнімі чынамі, прыбываючымі ў армію маршавымі ротамі, пацыфісцкія і іншыя ідэі не перастаюць пранікаць у асяроддзе ніжніх чыноў, з прычыны чаго ў некаторых выпадках праяўлялася недастатковасць энергіі і нават імкненне здацца ў палон. Так як падобныя ідэі могуць пранікаць толькі з боку, то галоўнакамандуючы арміямі Заходняга фронту загадаў прыняць самыя рашучыя меры для таго, каб ніжнія чыны не маглі мець ніякіх сувязяў з пабочным элементам, сярод якога могуць быць прапагандысты гэтых ідэй" [7, с. 876-877].

Вырашыць праблему спынення антываенных настрояў і зберагчы армію ад развалу царскі ўрад меркаваў з дапамогай жорсткіх рэпрэсій, масавых арыштаў, ваенна-палявых судоў і іншых мер. Напрыклад, у данясенні галоўнага начальніка мінскай

ваеннай акругі ад 10 сакавіка 1915 года паведамляецца, што “ніжнія чыны І.Ш.Зігер і Б.Н.Расінскі, ўраджэнцы Мінскай губерніі, пры пераходзе іх палка на ўмацаваную пазіцыю, здаліся ў палон ворагу не выкарастаўшы ўсіх сродкаў да супраціўлення. Такое ганебнае парушэнне названымі чынамі свайго абавязку перад царом і Радзімай дае права спыніць клопат аб дастатку іх сем’яў” [8].

З пункту гледжання расійскага ваеннага кіраўніцтва палон успрымаўся як ганьба, а палонныя адпаведна як здраднікі. У першую чаргу гэта датычылася тых, хто дабраахвотна здаўся ў палон будучы непараненым і не выкарыстаўшы ўсе неабходныя сродкі да абароны. Гэта, як бачым, спыняла матэрыяльную і харчовую дапамогу іхнім сем’ям, а таксама служыла адказам у арганізацыі перапіскі палоннага з сям’ёй на Радзіме. У цэлым жа выжыванне сярод ваеннапалонных было большым, чым тых, хто працягваў ваяваць на фронце. І расійскія салдаты працягвалі здавацца. Напрыклад, у сваім дзённіку нямецкі генерал Гофман канстатуе факт, калі 6 салдат на чале з лейтэнантам змаглі ўзяць у палон 600 казакоў, гарматы, аўтамабілі, лакаматывы [9, с.227]. І гэта быў не адзінкавы падобны эпізод, які часткова можна патлумачыць і тым, што немцы распаўсюджвалі лістоўкі з заклікамі да салдат праціўніка здавацца ў палон з абяцаннямі салодкага і сытнага жыцця ў палоне. А таксама прыбягалі да прыёму, калі прастых бязграматных салдат, узяўшы ў палон, частавалі рознымі дэлікатэсамі, паказвалі свае тэхнічныя перавагі, а затым дазвалялі ім збегчы да сваіх. Інакш кажучы выкарыстоўвалі ў якасці прапагандыстаў, якія дэмаралізавалі баявы дух расійскіх салдат. У сваи чаргу газета “Наш вестник”, што выдавалася пры штабе Галоўнакамандуючага расійскімі войскамі і была прадназначана для бясплатнай раздачы расійскім салдатам, пастаянна друкавала артыкулы аднаго накірунку з назвамі, якія часта паўтараліся: “Кровавая расправа с пленными”, “Германские неистовства”, “Немецкие зверства”, “Расстрел 5000 пленных” і г.д.[10]. Тым самым паказваючы, што ў германскім палоне зверствы і забойствы над расійскімі ваеннапалоннымі фактычна ўзведзены ў ранг сістэмы.

Усяго па прыкладных падліках у 1918-1921 гг. у Расію, Беларусь, Украіну, а таксама ў Закаўказзе, якое ў хуткім часе стала ЗСФСР (Закаўказскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікай), вярнулася 1 млн. 142 тыс. былых ваеннапалонных. Больш за 200 тысяч былі рэпатрыіраваны ў прыбалтыйскія краіны. 95 тысяч ваеннапалонных расійскай арміі самых розных нацыянальнасцяў пажадалі і змаглі застацца ў цэнтральнай Еўропе, фактычна адказаўшыся ехаць на Радзіму [11, с.15].

Для большасці еўрапейскіх краін па колькасці мабілізаваных у армію і па колькасці страт, у тым ліку ваеннапалонных, Першая сусветная вайна ў папярэдняй гісторыі не мела сабе роўных. Нягледзячы на 100-годдзе пасля яе завяршэння прывесці канкрэтныя, дакладныя лічбы па таму ці іншаму аспекту ваеннапалонных складана і пакуль немагчыма. Яны яшчэ даследуюцца і вывучаюцца, адкрываючы новыя, раней невядомыя старонкі, якія, спадзяёмся, пральюць свет у недалёкім будучым.


1. Головин, Н.Н. Военные усилия России в Мировой войне/ Н.Н. Головин. - Заключит. статьи И.В.Образцова. Жуковский. - Москва: Кучково поле, 2001. - 440 с.
2. Нагорная, О.С. Другой военный опыт: российские военнопленные Первой мировой войны в Германии (1914-1922) / О.С. Нагорная. – Москва: Новый хронограф, 2010 – 440 с.
3. Ирина Журавская. Три пайки хлеба / Журавская Ирина // Родина. Российский историко-практический журнал. -1993. - № 8-9. – с.136-137.
4. Сергеев, Е.Ю. Русские военнопленные в Германии и Австро-Венгрии в годы Первой мировой войны / Е.Ю. Сергеев// Новая и новейшая история. - 1996-№4-с.65-78.
5. Цуба, М. В. Першая сусветная вайна ў лічбах і фактах / М. В. Цуба // Веснік Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя грамадскіх і гуманітарных навук: научно- практический журнал. – Пинск: полесГУ, 2014. - №2. – с.16-21.
6. Цуба, М.В. Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенны бакі) 1914- 1918 гг.: Манаграфія / М. В. Цуба. – Пінск : ПалесДУ, 2010. – 304с.
7. Документы и материалы по истории Белоруссии (1900-1917гг.) .- Минск: Изд-во АН БССР, 1953.- Т.3. – 1019 с.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусі (НАРБ)-Ф.295. - Воп. 1. - С.8642.-Л.93.

9. Голденков, М.А. Первая мировая война:100 лет мифов /М.А.Голденков. – Минск: ФУА информ ,2014. - 288 с.
10. Российский государственный военно-исторический архив (РГВИА)- Ф.2019, об. Наш вестник. Июль 1915г. № 40-51.
11. Телицин, В.Л. Возвращение домой. К истории русских военнопленных Первой мировой войны / В.Л. Телицин. – Москва: Духовность, 2011. –99с.

Репозиторий ПолесГУ

## POWs OF THE FIRST WORLD WAR

***Michail Tzuba***
*Polessky State University, Pinsk, Belarus*

Article devoted to the problem of POWs of the WWI

***Keywords: First World War, prisoners of war, the Allies, the Red Cross***